УДК 378.016: 811.116.3

# АБ НЕКАТОРЫХ СТРУКТУРНЫХ ЭЛЕМЕНТАХ І ТЭХНАЛАГІЧНЫХ ПРЫЁМАХ НАВУЧАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ НА СПЕЦЫЯЛЬНЫХ ФАКУЛЬТЭТАХ.

**Шлык І.М.**

УА "Гродзенскі дзяржаўны аграрны універсітэт",
г. Гродна Рэспубліка Беларусь

Выкладанне – працэс двухбаковы. І, каб павысіць яго эфектыўнасць, выкладчык павінен увесь час апеляваць за самасвядомасці, інтарэсу і здольнасцей студэнтаў. Задача выкладчыкаў беларускай мовы, якія працуюць на спецыяльных факультэтах – не толькі сістэматызаваць і паглыбіць веды, набытыя ў школе, але развіць і ўдасканаліць маўленчую дзейнасць студэнтаў у прафесійнай сферы, а таксама свабодна перакладаць навуковыя спецыяльныя тэксты з рускай мовы на беларускую і наадварот, але і навучыць студэнтаў карыстацца ўсім багаццем роднай мовы.

Першым крокам у адукацыйным працэсе з'яўляецца распрацоўка вучэбна-метадычных комплексаў, якія ўключаюць у сябе рабочы план і праграму курса, тэзіснае выкладанне лекцыйнага матэрыялу, тэмы і пытанні для практычных заняткаў, пытанні для самакантролю, тэсты, спіс літаратуры і г.д.

Выкладчыкі арыентуюцца не толькі на перадачу студэнтам пэўнага набору ведаў, але і на ўменне прымяняць гэтыя веды ў практычнай дзейнасці, стымуляванне творчай актыўнасці студэнтаў. Змест вучэбна-метадычнага комплекса павінен адпавядаць сённяшнім рэаліям, таму неабходна стала аднаўляць як тэарэтычны, так і практычны матэрыял.

Важным з'яўляецца арыентацыя выкладчыка на ўкараненне актыўных метадаў навучання. Гэта звязана са змяненнем пазіцыі студэнта і выкладчыка ў камунікацыйным працэсе, у аснове якога ляжыць прынцып адваротнай сувязі. Традыцыйная лекцыя саступае месца інавацыйнай (альбо актыўнай), у якой акцэнт робіцца не на перадачы большага аб'ёму інфармацыі, а на павышэнне якасці яе засваення, фарміраванні ўласнага погляду студэнта на праблему, якая абмяркоўваецца. Змяняюцца таксама і формы правядзення практычных заняткаў. Найбольш эфектыўнымі з'яўляюцца дэбаты, метад канкрэтных сітуацый, дзелавыя гульні і г.д.

У навучанні дапамагаюць таксама і розныя тэхналагічныя прыёмы, ці спосабы педагагічных дзеянняў у пэўных умовах. У рабоце "Педагагічная тэхніка ў кантэксце адукацыйнай тэхналогіі" В.В. Гузееў вылучае экстраактыўныя, інтэрактыўныя і інтраактыўныя тэхналагічныя прыёмы.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

Экстраактыўныя прыёмы характэрны для лекцый. Усе інфармацыйныя патокі цыркулююць паза аб’ектам навучання ці накіраваны на яго.

Інтэрактыўныя прыёмы характэрны для практычных і семінарскіх заняткаў, гутарак, кансультацый. Напрыклад, кампазіцыйна-структурны ці лексіка-граматычны аналіз тэксту па спецыяльнасці дазваляе развіць увагу, свядома засвойваць матэрыял, набыць устойлівыя навыкі працы з тэкстам. Сярод прыёмаў атрымання інфармацыі вылучаецца тэхніка “правакацыйных пытанняў”, якая дазваляе выявіць, наколькі студэнт валодае матэрыялам.

Інтраактыўныя прыёмы характэрны для самастойнай вучэбнай дзейнасці, пры напісанні рэфератаў, дакладаў, курсавых і т.п. Прыёмы развіваюць лагічнае мысленне, дазваляюць студэнтам самастойна выкладаць свае думкі.

Самастойная (пазааўдыторная) работа студэнтаў неабходная састаўная частка вучэбнага працэсу. Яна дапаўняе і забяспечвае эфектыўнасць аўдыторнай работы. Аб неабходнасці пазааўдыторнай работы сведчыць фактар часу, т.я. немагчыма ахапіць увесь матэрыял курса на аўдыторных занятках. Перавагу трэба аддаваць не маналагічнай форме выкладання, а дыялагічнай, якая звязана з большай падрыхтаванасцю студэнтаў да канкрэтнай і загадзя вызначанай працы на занятках, з павышэннем элемента самасвядомасці ў навучанні. Віды заданняў для самастойнай работы студэнтаў самыя разнастайныя. Гэта і практыкаванні граматыка-лексічнага характару, накіраваныя на актывізацыю лексікі, і падрыхтоўка дакладаў, рэфератаў па актуальнай праблематыцы, дыялогі-дыскусіі па раней вызначанай тэме. Неабходна распрацоўваць методыку вучэбных камунікатыўных практыкаванняў, звязаных з прафесійнымі патрабаваннямі студэнтаў. У гэтым можа праявіцца педагагічнае майстэрства выкладчыка.

Ініцыятыва ў працэсе навучання належыць выкладчыку. Але трэба памятаць, што ініцыятыва і самасвядомасць студэнтаў таксама маюць значэнне. І аўдыторная, і пазааўдыторная работа маюць агульную мэту – фарміраванне канкрэтных навыкаў на базе пэўнага моўнага матэрыялу.

**Рэзюмэ**

Важным крокам у рэфармаванні навучальнага працэсу з’яўляецца арыентацыя выкладчыкаў на ўкараненне актыўных метадаў навучання. Выкладчыкі арыентуюцца не проста на перадачу студэнтам пэўнага набору ведаў, але і на ўменне прымяняць гэтыя веды ў прафесійнай дзейнасці, стымуляванне творчай актыўнасці студэнтаў.
Ключавыя словы: формы правядзення практычных заняткаў: дэбаты, метад канкрэтных сітуацый, дзелавыя гульні, ралевы трэнінг,



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

тэхналагічныя прыёмы навучання: экстраактыўны, інтэрактыўны, інтраактыўны, самастойная (пазааўдыторная) работа.

**Summary**

**On Some Structural Elements and Technological Means of Teaching the Belarussian Language at Speciality Faculties**

**Shlyk I.M.**

An important step in reforming educational process is to use active methods of teaching. Teachers not only give students certain knowledge but help them to use it in their professional activity and stimulate creative abilities of students.

Key words: forms of practical lessons; debates; method of concrete situations; business games; role training; technological means of teaching; extraactive; interactive; intraactive; individual work.

УДК 378.016 : 811.161.3

# МОЎНЫ ТЭСТ ЯК ВЫНІКОВАЯ ФОРМА КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ СТУДЭНТАЎ

**Садоўская З.Я.**

УА "Гродзенскі дзяржаўны аграрны універсітэт"
г. Гродна Рэспубліка Беларусь

Усім вядома, што цэнтралізаванае тэсціраванне па беларускай і рускай мовах з'яўляецца абавязковай умовай пры паступленні ў вышэйшыя навучальныя ўстановы Рэспублікі Беларусь. Тэстам цяпер надаецца вялікая ўвага яшчэ ў школе. Сённяшнія студэнты добра знаёмы з гэтай формай апытвання, і няма неабходнасці траціць многа часу на тлумачэнне іх выканання, таму мы таксама даволі часта звяртаемся да гэтай формы кантролю, бо тэсты з'яўляюцца не толькі надзейным сродкам выяўлення ведаў і ўменняў студэнтаў, развіваюць здольнасць самастойнага даследавання, але і эканомяць час, які прыходзілася траціць на калоквіумы, пісьмовыя кантрольныя работы і індывідуальныя апытванні.

У праграму беларускай мовы ВНУ ўваходзяць тэмы: "Мова і соцыум", "Гістарычныя этапы фарміравання і развіцця беларускай мовы", "Праблемы беларуска-рускай інтэрферэнцыі", "Лексіка і лексікаграфія", "Асаблівасці навуковага стылю", "Беларуская навуковая тэрміналогія", "Стылістыка афіцыйна-справавых папер", але магчымасці для разгляду гэтых пытанняў неаднолькавыя. Не вельмі многа часу адводзіцца для разгляду такога важнага пытання як "Гітарычныя этапы фарміравання і развіцця беларускай мовы". Хаця ўсім вядома, што адукаваны чалавек павінен ведаць гісторыю свайго народа, карані сваёй мовы. Вывучэнню



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ